Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Цана асобнага нумару 20 грошаў.

НАША ВОЛЯ

Выходзіць два разы у тыдзень

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адмiністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая дарожэй. Перамена адрэса 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 4 Вільня, Субота 12-га сакавіка 1927 г. Год I

Вынікі гаспадарчае перабудовы.

Хутка пасьля маёвага перавароту, калі марш. Пілсудскі завязываў такія мілыя адносіны з прадстаўнікамі абшарніцтва на знамянітым зьездзе ў Нясьвіжы,—радыкальная беларуская прэса адзначала тыя вынікі, якіх трэба спадзявацца ад новага гаспадарчага курсу „маёвага“ ўраду. Курс гэты, апіраючыся на абшарніцкіх сфэрах і ў аснову ўсяе дзяржаўнае гаспадаркі кладучы інтарэсы вялікіх зямляўласьнікаў, зусім натуральна мусіў ісьці па шляху, вельмі непажаданым для польскае прамысловасьці. Больш таго: газэты адзначалі з глыбокім пераканаўнем, што Польшчу чакае поўны заняпад прамысловага жыцьця, ды што гэтак яна абернецца ў рынак збыту для вырабаў англійскае прамысловасьці.

Ясна, які вынік гэтага мусіў быць для вялізарнае арміі работнікаў у Польшчы. Ясна, што такая зьмена ў гаспадарчым жыцьці дзяржавы павінна адбіцца перадусім на працоўных места. — І вось жыцьцё найлепш пацьвярджае гэтыя прадбачаньні.

Газэты паведамляюць аб вялізарнай хвалі работніцкіх забастовак у Польшчы. Сьледам за агульнай забастоўкай усіх гутнікаў Польшчы распачата забастоўка ў найважнейшай галіне польскае прамысловасьці — ткацкай. Забаставалі ткацка-прадзільныя фабрыкі ў Лодзі, у Белай і Бельску на Сьлёнску. І навет правая прэса прызнае, што падстава забастовак—*чыста эканамічная*, навет самі фабрыканты ня маюць адвагі закідаць забастоўшчыкам „бальшавіцкія чырвонцы“ і іншыя падобныя „хадзячыя закіды“.

Эканамічны крызіс у польскай прамысловасьці дасьпявае. Чарод — за вугальнымі капальнямі, якія ўжо прымушаны абмяжоўваць сваю вытворчасьць з прычыны адсутнасьці збыту. І калі йшчэ зімой унутраны рынак забіраў значную колькасьць вугальля, дык з вясной і гэтае спажываньне вугальля шмат паменшыцца.

Прамыслоўцы займаюць непрымірымае становішча. Урадавая прэса тлумачыць гэта „незалежнымі ад іх волі прычынамі“.—Але-ж у гэтым і трагізм польскага жыцьця, што яно само ня ў сілах залечываць свае раны, што дзеля захаваньня ў ёй „сацыяльнае раўнавагі“ не памагае ані „добрая воля“ валадаючых клясаў, ані—сіла дзяржаўнае ўлады...

Рэфарматары польскага гаспадарчага жыцьця ад слоў перайшлі ўжо да дзела. Польшча мае ператварыцца ў выключна зямляробскі край, і за гэта павінны заплаціць сваім дабрабытам — работнікі фабрык і заводаў.

Калі нейкі рух у дзяржаве выклікае агітацыя тэй ці іншай „вывротовай“ партыі,—гэта рэч, з якой яшчэ можна змагацца і перамагаць. Калі-ж хваляваньне выклікаюць варункі жыцьця, якіх зьмяніць нельга, — дык барацьба з такімі рухамі — *безнадзейная*.

Разбурываньне беларускіх гімназіяў.

Пасьля заяваў міністра асьветы Добруцкага, які ў бытнасьць сваю ў Вільні абяцаў ,,заапекавацца“ беларускімі гімназіямі ў Заходняй Беларусі, — віленскае куратарыум пачало канкрэтныя крокі дзеля ,,падняцьця на належную вышыню“ гэтых гімназіяў.

Так, надовячы віленская беларуская гімназія атрымала ад куратара паведамленьне, што пяць вучыцялёў ,,з прычыны неблаганадзёжнасьці“ мусяць быць звольнены з канцом гэтага школьнага году. Імёны іх: І. Савіцкі, Заморын, Паўловіч, Сіняўскі і Міхалевіч. У чым іх ,,неблаганадзёжнасьць“ — трудна навет дагадацца: у палітычным жыцьці прымае чыннае ўчасьце, здаецца, адзін толькі грам. Савіцкі, які зьяўляецца старшынёй Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні. Імёны ўсіх другіх абсалютна ня зьвязаны ні з якой ,,палітыкай“. Грам. Міхалевіч ,,праштрафіўся“ хіба тым, што рэжысаваў вучнёўскія спэктаклі...

Адначасна радашкоўская гімназія атрымала паведамленьне, што дадзеная ёй канцэсія канчаецца з канцом гэтага школьнага году, — дый там рад вучыцялёў прызнаны ,,неблаганадзёжнымі“.

У Сойме.

Справа рэкруцкага набору.

На адным з апошніх паседжаньняў Сойму разглядалася, паміж іншым, справа рэкруцкага набору.

Дакладчык пас. **Мончыньскі** пачаў з таго, што запрапанаваў прыняць закон аб наборы аднадушна—бяз ніякіх гутарак, адзначыўшы, што „некаторыя цыфры павінны наагул астацца тайнымі, а аб іншых можна гаварыць і публічна“. З тых цыфраў, аб якіх „можна гаварыць публічна“, адзначым агульную лічбу рэкрутаў, якая дасягае агулам бязмала паўмільёна. Свой даклад пас. Мончыньскі закончыў заявай, што польскія партыі ня будуць прымаць учасьця ў дыскусіі, бо лічаць, што справа абароны дзяржавы не выклікае ніякіх сумліваў.

І запраўды. Ледзь пасьпеў пас. **Назарук** (украінец) прачытаць сваю дэклярацыю аб ад'емных адносінах ягонага клюбу да закону аб рэкрутчыне, як марш. Сойму загадаў галасаваньне прапазіцыі эндэкаў аб спыненьні дыскусіі. І ўсе польскія партыі—пачынаючы ад пэпээсаў управа—згадзіліся адмовіцца ад магчымасьці выказаць публічна свой пагляд на гаспадарку ў ваеннай галіне Польшчы. Пасьля гэтага так-жа аднадушна польскімі галасамі быў прыняты і самы закон. Проці закону падалі галасы нацыянальныя меншасьці—апрача жыдоў, Нез. Партыя Хлопска і камуністы.

Тым часам якраз у гэты мамэнт вайсковыя справы ў Польшчы высунуліся на першы плян, і аб іх трэба і можна шмат думаць і гаварыць. Мала таго, што на чале ўраду стаіць міністар вайсковых спраў маршалак Пілсудскі, што ваенныя назначаюцца як на становішчы міністраў (прыкладам унутраных спраў), так і ваяводаў і старастаў. Імкненьне ўраду—правясьці „вайсковае прыспасабленьне“ сярод усяго насяленьня гаспадарства, каб кожная гміна, кожнае мястэчка мелі свайго інструктара і аружжа дзеля вайсковага вучэньня. У школах уводзіцца „фізычнае узгадаваньне“ моладзі, якое мае на мэце перадусім падрыхтаваць будучых жаўнераў. Усюды ладзяцца стрэльбішчы — дзеля прывучаньня моладзі да карыстаньня аружжам. І хаця ня ўсё гэта яшчэ праведзена законамі Польшчы, аднак, праводзіцца ў жыцьцё, аб чым сьведчаць чысьленыя прэсавыя весткі. Гэтак, надовячы пісалася аб пасольскай інтэрпэляцыі ў справе львоўскага старасты, які разаслаў гмінным камісарам свайго павету загад аб выдзяленьні з грамадзкае зямлі па 2 да 4 маргоў дзеля мэтаў фізычнага ўзгадаваньня. У газэце „Новы Час“ № 22 наказывалі, што ў Расьне Рускай у тым-жа павеце, на падставе сказанага загаду, гмінны камісар даў 2 маргі пожні, 200 злотых гатоўкай з грамадзкіх грошы, дый яшчэ дом, у якім зьмяшчаюцца украінскія культурныя ўстановы... А стараста ў Перамышлянах (у Усходняй Галічыне), які адначасна зьяўляецца старшынёй павятовага камітэту фізычнага ўзгадаваньня, зьвярнуўся да ўсіх украінскіх культурна асьветных устаноў з „просьбай“, каб з усіх спэктакляў рабілі адлічку на мэты гэнага камітэту...

Ясна, што справы вайсковыя пры сучасным курсе палітыкі ўраду вельмі глыбака закранаюць усё грамадзкае жыцьцё, — дык было шмат аб чым думаць і гаварыць Сойму. Але—апрача „меншасьцяў“ і сялянска-работніцкіх партыяў — ніводная з польскіх партыяў не адважылася абгаварываць і—барані божа!—крытыкаваць тое, што праводзе ў жыцьцё марш. Пілсудскі... „Новая сыстэма“ ўлады ў Польшчы ўжо даволі крэпка ўкаранілася, і Сойм запраўды ж істнуе ўжо адно толькі дзеля віду!

Зьмены выбарнага закону ў Сойм і Сэнат.

На паседжаньні канстытуцыйнай камісіі Сойму, якая працуе над 4 праектамі Хіены і Пяста ў справе зьмены выбарнага закону (да парляманту), дакладчык камісіі эндэк **Гломбіньскі** запрапанаваў апрацаваны зборны праект, у якім сабраў кветкі ды ягадкі ўсіх 4 праектаў соймавай рэакцыі. Але, можа, найбольш характэрным у гэтым зборным праекце польскай рэакцыі — ў справе абмяжаваньня ў краі дэмакратызму, а перадусім — палітычнай роўнапраўнасьці няпольскага насяленьня „крэсаў“—зьяўляецца тое надзвычайнае даверые, якое гэтая польская рэакцыя мае да сучаснага „дэмакратычна-радыкальнага“ (інакш—„абшарніцка-пэпэсаўскага“) ўраду п. Мэйштовіча-Морачэвскага. А іменна: зборны праект п. Гломбіньскага прапануе Сойму — замест тасаваньня доўгай парляманцкай валакіты, — усю справу зьмены выбарнай „ардынацыі“ аддаць у рукі ўраду, даўшы яму дзеля гэтага шырокія паўнамоцтвы, у тым ліку—права выдаць новы выбарны закон шляхам дэкрэту п. Прэзыдэнта. Сойм меў бы толькі—паводле праекту п. Гломбіньскага—даць ураду пэўныя абязываючыя ўказаньні,—напрыклад: каб паслоў ня было больш за 300 (а менш — дык „бардзо прошэн“: ведама-ж, кожны „лішні“ пасол адымаецца ад прадстаўніцтва работнікаў і сялян!); сэнатараў мае быць ізноў чацьвертая частка лічбы паслоў — дык ужо ня 110, але ўсяго толькі 75. Далей праект прадбачыць шырокія паўнамоцтвы для ураду ў вызначэньні новых выбараў.

Урад дагэтуль неяк устрымліваўся ад учасьця ў працах камісіі, але заявіў рашуча, што ён вельмі цікавіцца справай зьмены ардынацыі да парляманту. Трэба думаць, што ўрад апраўдае цалком высокае даверые соймавай правіцы і „цэнтру“, з якімі ўсё бліжэй уваходзіць у фактычнае паразуменьне..

Пісьмо пасла Воевудзкага.

Мы атрымалі поўны тэкст пісьма пасла Воевудзкага ў сувязі з „маршалкоўскім судом“ над ім, пасланае маршалку Сойму, пану Ратаю. Падаем яго поўнасьцяй:

Пане Маршалку!

Як я і спадзяваўся, маршалкоўскі „суд“ не захацеў даць сьвядоцтва ўсей праўдзе ў справе кіненае на мяне брахні.

Праўда,—навет так дабраная кампанія „судзьдзяў“—абвініцеляў мусіла сцьвярдзіць, што я ня быў платным—дый наагул агентам дэфэнзывы, што не данасіў на маіх соймавых калегаў, што грошы з эвідэнцыйнага аддзелу нацыянальнага аддзелу генэральнага штабу ня браў, як асабістую для мяне заплату;—аднак, „прыгавор“ мае ў сабе цэлы рад недасказаў і асьвятленьняў, ды навет перакручваньняў паказаньняў сьведкаў (прыкладам Крука Стшэлецкага), якія зацямняюць абраз усяе праўды—сумысьля і крывадушна.

Не ўваходзячы ў падрабязную палеміку з „прыгаворам“, ды з яго „матывамі“, лічу і далей, што толькі апублікаваньне поўнага тэксту стэнаграмы паседжаньняў „суда“, а також рэфэратаў—дасьць поўны абраз справы і выявіць хоць часьціну „тайн“ і мэтадаў працы выбранцаў пілсудчыны.

Асабліва, аднак, мне йдзе аб апублікаваньне рэфэратаў, у перадачы якіх нацыянальнай сэкцыі я быў пасрэднікам, бо гэта дакажа з поўнай ачывістасьцяй, што гэтыя рэфэраты, як і ўсе мае адносіны да беларускага руху, ішлі па лініі сыстэматычнае абароны вызвольных імкненьняў беларускага народу, па лініі—як выразіліся навет некалькі сьведкаў абвіненьня — „дамаганьня для беларусаў больш, чым яны самі дамагаліся“. Толькі ў агульнай ацэнцы характару рэфэратаў п. Сьвяневіча набіраюць праўдзівага значэньня пушчаныя спрытна закіды аб нібы то выкрываньні літэратурных псэўданімаў і дачы інфармацыі аб сакалох. Псэўданімы гэныя, як да прыкладу Луцкевіча („Навіна“), у беларускай прэсе таксама агульна ведамы, як псэўданім Главацкага („Прус“) і Познэра („Бэзмаскі“); а ведамасьці аб сакалох узяты з краёвае і заграмічнае прэсы.

У канцы „судзьдзі“ паказуюць мне шлях дзеля выясьненьня закідаў „Глосу Правды“ аб нібы-то маіх блізкіх зносінах з ГПУ: зьвярнуцца да дзяржаўнага суда. Сцьвярджаю, што ў часе працы „суда“ закід гэты не падцьвярдзіўся. Аднак, з увагі на тое, што прадстаўленыя панам віцэпрэм'ерам Бартлем матэрыялы, якія павінны былі даказаць, што брахня „Глосу Правды“ „ляжыць у плошчы праўды“, мусяць зьмяшчаць і доказы платнага супрацоўніцтва майго з ГПУ,—лічу, што „судзьдзі“ павінны да канца пасьлядоўна выпаўніць гулявую імі дагэтуль ролю і аддаць гэныя матэрыялы дзяржаўнаму суду.

Працэсавацца з прафэсіянальнымі брахунамі і ворагамі працоўнага народу, якія кожны дзень робяць даносы і абліваюць гразёй змаганьне сялян і работнікаў,—лічу для сябе абідным.

(—) **Сыльвэстар Воевудзкі.**

Варшава, 3 сакавіка 1927 г.

У Польшчы.

Агульная забастоўка ў прадзільна-ткацкай прамысловасьці.

8 сакавіка зраніцы распачалася агульная забастоўка ў валакністай прамысловасьці ў-ва ўсей Польшчы.

У Лодзі спынілі працу ўсе фабрыкі, за выняткам толькі 3 — 4, спаміж якіх адна толькі — вялікая. Настрой бастуючых усюды вельмі бадзёры. Спакой, дысцыпліна і ўстрыманасьць работнікаў — поўныя.

Было некалькі спробаў штрэйкбрэхерства, але бастуючыя работнікі хутка іх зьліквідавалі, застыдзіўшы здраднікаў работніцкай справы.

У Бельскім раёне (на Сьлёнску) таксама ў той-жа дзень забаставалі ўсе фабрыкі. У Згежу, Пабіяніцах, Озоркове, Здунскай Волі, Канстантынаве, Пётркове, Белхатаве — праца на фабрыках спынена зусім. У Тамашове, апрача часткі вялікіх фабрыкаў, таксама праца спынілася.

Забастоўка мае выключна эканамічны грунт дый справакавана папросту прамыслоўцамі, якія—на дамаганьні павялічэньня платы на 25 проц.—адказалі папросту зьдзекам, прапануючы—розным групам работнікаў розныя дадаткі — ад 1 да 6 проц. (ведамая тактыка працадаўцаў, каб пасварыць работнікаў розных катэгорыяў ды гэтым — разьбіць супольны фронт забастоўкі)...

Пагроза забостоўкі ў сернікавай прамысловасьці.

6 сак. адбылася канфэрэнцыя дэлегатаў сернікавых фабрыкаў Польшчы, на якой аднагалосна была прынята пастанова — заявіць прамыслоўцам ультыматыўныя трэбаваньні ў справе падвышкі платы. Калі прамыслоўцы не дадуць да 14 сак. адказу, — будзе абвешчана агульная забастоўка ў-ва ўсіх сернікавых фабрыках Польшчы.

Як ведама, сернікавая прамысловасьць у Польшчы знаходзіцца пад манаполіяй заграмічнага капіталу, дык трэба думаць, што барацьба работнікаў будзе асабліва цяжкая...

„Партыя п. Бартля арганізуе штрэйкбрэхераў“.

„Роботнік“ паведамляе, што ў памяшчэньні „Клюбу Працы“ (партыі п. Бартля) адбылося сабраньне розных работнікаў, якіх адзін з павадыроў „Клюбу“ намаўляў, каб яны ламалі забастоўку ткачоў ды прадзільшчыкаў. „Вестка гэтая выклікала вялікае і зразумелае абурэньне сярод валакністых работнікаў. Пэпээсы абураюцца на тое, што — „партыя п. Бартля“ (таксама — „партыя працоўных“...) робіць пэпээсам тое самае, што пэпээсы камуністам!

„Крывавыя здарэньні ў Чэнстахове“.

„Роботнік“ паведамляе аб крывавым здарэньні ў Чэнстахове. Таўпа безработных сабралася перад фабрыкай Ульлен, якая, як паведаміла фальшыва мясцовая газэта, патрабуе аж 400 работнікаў. Аказалася, што трэба толькі 40... Таўпа, якой надзеі былі ашуканы, уварвалася ў будынкі фірмы і ўрадавай установы „Пасрэдніцтва Працы“... Была выклікана паліцыя. У выніку націску паліцыі — больш дзесятка асобаў ранены.

Аб‘яднаньне „крэсавага“ заканадаўства.

Рада Міністраў апрацавала праект дэкрэту п. Прэзыдэнта ў справе ўрэгуляваньня так-званага „праўнага стану“ ў Усходніх ваяводзтвах. Праект высьняе, якія з істнуючых законаў маюць надалей мець абязываючую сілу на „крэсах“. Справа йдзе аб вялізарнай масе законаў і дэкрэтаў, якія пакінулі розныя панаваўшыя ў нас улады — расейская, акупацыйная нямецкая і польская—у часох ваенных, з якіх дэкрэт выбраў—пэўна-ж ўсё найлепшае...

У справе амэрыканскай пазыкі для Польшчы.

Газэты (польскія) пішуць, быццам амэрыканская пазыка для Польшчы (трэба думаць—пад гарантыяй Англіі) мае шансы на пасьпех. Быццам амэрыканскія банкіры прапануюць Польшчы 50 мільёнаў даляр. на санацыю валюты (ўкрапленьне злотага), дый яшчэ 50 мільён. дал. — на капітальную разбудову гаспадарчага жыцьця. Але да гэтай прапазіцыі амэрыканскія банкіры дадаюць пэўныя варункі, якія чамусьці трымаюцца ад усіх у сакрэце. Газэты неяк даведаліся, быццам банкіры адмовіліся ўжо ад варунку арганізацыі міжнародавага (ці францускага?!) фінансавага кантролю над тым, як польскі ўрад будзе расходаваць пазычаныя грошы. Амэрыканцы, аднак-жа, стаўляюць варунак, каб быў значна павялічаны (ведама ж фондамі з гэтай пазыкі!) закладовы капітал Польскага Банку, у якім датаго банкіры гэтыя мелі бы свайго дырэктара—сябру ўправы Банку...

Яшчэ адзін „разьвенчаны“ афіцыёз...

Пасьля „разжалаваньня“ з афіцэраў—перапрашаем: з афіцыёзаў! „Глосу Правды“, Прэзыдыум Рады Міністраў таксама „разьвянчаў“ другі орган, які таксама, як першы, жыве з „дыспазыцыйных фондаў“ паноў міністраў: „Эпоку“. Праўда, абедзьве газэты—даволі дурнаватыя, дык робяць больш сораму, як карысьці ўраду, але найляпей — без запярэчаньняў, якім ня ўсе ў краі і заграніцай так ужо вераць,—было б папросту спыніць гэтым органам злотавую „падсыпку“... Але гэтага якраз урад ня робіць...

Заграніцай.

Гутаркі між Штрэзэманам і Залескім.

У Жэнэве адбыліся гутаркі між Штрэзэманам і Залескім—у справе злагоджаньня гаспадарчай вайны між Нямеччынай і Польшчай.

Весткі радавай прэсы—аб польска-англійскім паразуменьні.

„Известия“ друкуюць карэспандэнцыю з Варшавы, у якой падаецца сэнсацыйны плян шырокай англійска-польскай акцыі на Усходзе, да якой Англія хоча за ўсялякую цану ўцягнуць і Нямеччыну. Вось галоўныя пункты гэтай „англійскай праграмы“:

Польшча зракаецца „Гданскага калідору“ і „ў паразуменьні з Нямеччынай выраўноўваюцца польска-нямецкія граніцы—у Пазнаншчыне і Сілізіі. За гэта Польшча атрымоўвае „свабоду дзеяньня“ ў адносінах да Літвы і Клайпэды. Англія „дае“ Польшчы—„вярхоўную ўладу“ над права-бярэжнай Украінай з Адэсай.

Што датычыць лева-беражнай Украіны з данецкім вугальным басэйнам, дык з яе творыцца „Незалежная“ Украіна—пад пратэктаратам Польшчы і... Нямеччыны. Нямеччына — за гэта ўсё абяцуе памагчы Польшчы—у разе апору з боку СССР!

Карэспандэнт запэўняе, што гэтая праграма ў значнай меры адпавядае настроям уплывовых польскіх колаў, акружаючых марш. Пілсудскага.

Ніякіх тлумачэньняў да ўсяго гэтага — ня трэба!

Нямецкая дыпляматыя ў Латвіі.

Жэнэўскія газэты пішуць, быццам нямецкая дыпляматыя шмат памагае радаваму ўраду дайсьці да паразуменьня з Латвіяй — у справе падпісаньня гарантыйнае ўмовы. Ведама, якое значэньне мае латвійскі шлях для зносінаў між Нямеччынай і СССР, асабліва пасьля захапленьня Літвы англійскімі ўплывамі.

„Прызнаньне“ Італьянскім урадам румынскага захвату Бэсарабіі.

Італьянскі ўрад заявіў, што Італія прызнала законнымі фактычныя граніцы між Румыніяй і СССР, „зацьвярдзіўшы“ гэткім чынам захват Румыніяй Бэсарабіі. Француская прэса слушна дагледзіла ў гэтым акце Мусоліні — уплыў новага англійска італьянскага паразуменьня ў справе супольнага фронту проці Масквы.

Англійскія газэты агітуюць проці СССР.

Англійскія проці-радавыя газэты дамагаюцца ад ураду, каб ён арганізаваў „санітарны кардон“ навакол СССР. Яны закідаюць Чэмбэрлэну, што ён не парваў сягоньня адносінаў з Радамі, але хваляць за тое, што ён зусім не абяцаў, што не парве іх заўтра.

Трывога ў Англіі.

Праца радавай дыпляматыі ў Латвіі і Эстоніі выклікае страшэнную трывогу ў Англіі, якая пэўна-ж мае надзею таксама „фашызаваць“ іх, як і Літву, ці каго-іншага. Урадавая газэта „Таймс“ піша, што радавы ўрад робіць такія карысныя прапазіцыі Латвіі, што яна пэўна-ж не ўстаіць перад пакусай, „ня гледзячы на крывадушнасьць радавых прапазіцыяў“.

Англія падпаляе новую вайну.

Адносіны між Грэцыяй і Югаславіяй раптам завастрыліся, пагражаючы ваенным канфліктам. Чаму, скуль? Югаслаўскія газэты ясна кажуць: з ласкі Англіі. Англія выпаўняючы ўмову з Мусоліні, пачала „аблягчаць“ яму захват Балканскіх дзяржаваў (падобна, як робіць гэта — на карысьць Польшчы—з балтыцкімі!). Грэцка-югаслаўскае паразуменьне ў справе Салонікаў (Салуні) раптам парвана Грэцыяй, якая высунула новыя дамаганьні, на якія ня можа пайсьці Югаславія. Югаслаўская прэса апублікавала сэкрэтнае даручэньне англійскага ўраду свайму паслу ў Белградзе, з якога ясна відаць правакацыйная роля Англіі на Балканах.

Прысьпяшэньня эвакуацыі Надрэніі ня будзе!

Быццам на ўсе захады Штрэзэмана, як францускі, таксама і бэльгійскі міністры замежных спраў адказалі, што на гэта яшчэ не насьпеў час.

Барацьба за вызваленьне Кітаю.

На Шанхайскім фроньце.

На Шанхайскім фроньце быццам поўны застой—з прычыны дажджоў, якія тут пачаліся.

Заява Чанг-Тсо-Ліна.

Чанг Тсо-Лін заявіў, што канчатковая мэта ўсіх кітайскіх партыяў — адна: здабыцьця незалежнасьці Кітайскай Рэспублікі. Але перадусім трэба „адбудаваць у краі парадак і мір дый паставіць законную ўладу“. „Ад чужаземцаў мы трэбуем поўнай раўнапраўнасьці і пашаны да нашага незалежнага гаспадарства“. Я не ваюю ні з адной з кітайскіх партыяў, апрача—левай часткі „Куо-Мін-Танг“ (камуністаў). Ад гэтага бальшавізму я і хачу ачысьціць Кітай“. „Вельмі сумна, што кантонскі ўрад („бальшавікі“) дабіўся аружжам і пагрозамі таго, чаго ня мог дабіцца ляяльны пэкінскі ўрад — дыпляматычнымі перагаворамі“.

Вось у гэтымі ўся штука: ці ж можа чаго дабіцца ад чужаземных жываедаў урад, якія зьяўляецца іх наймітам?! Дый ці ня дзіўная „праграма незалежнасьці ды сувэрэннасьці“ Кітайскай Рэспублікі ў гэтага найміта, які ізноў — тым жа „дыпляматычным шляхом“—хоча вымаліць у чужаземцаў — „роўнасьць з чужаземцамі“ для кітайскага народу—ў яго ўласным ад вякоў краі?! А тое, што гэты наймітякраз вядзе вайну з тым кантонскім урадам, які, як ён сам кажа, „дабіўся“ ўжо вельмі важных рэчаў для кітайскага народу аружнай сілай, дык — на тое ж ён, гэты дабрадзей Кітаю, і заняты жываедамі.

Ультыматум кантонскага ўраду.

Кантонскі ўрад выслаў корпусу замежных дыпляматаў у Шанхаі ноту, трэбуючы ачышчэньня кітайскай тэрыторыі ад насланых туды чужаземных войскаў, бо на гэта кітайскія ўлады не далі сваей згоды.

Кітайскія нацыянальныя партыі і Ліга.

Павадыры кітайскіх незалежнікаў пастанавілі не пасылаць ніякага паўнамоцніка на сэсію Рады Лігі—дзеля дагляду яе прапаў.

Ліга Народаў дала ізноў пазыку Вэнгрыі.

Рада Лігі Народаў пастанавіла даць Вэнгрыі рэшту прызнанай ей пазыкі – 50 мільёнаў залатых крон.

Чэмбэрлен проці разгляду ў Радзе англійска-кітайскага канфлікту

Чэмбэрлен у сваей гутарцы з жэнэўскімі журналістамі заявіў, што Англія прынцыпова (?) нічога ня мае проці таго, каб Ліга занялася справай канфлікту Кітаю з Англіяй, але—лічыць, што „мамэнт дзеля гэтага яшчэ не насьпеў“. Не насьпеў, ведама ж — бо Англія яшчэ мае надзею пабіць кітайцаў, праліўшы мора іх крыві. А здавалася-бы задача Лігі—якраз не дапускаць разліву крыві, асабліва—паміж сябрамі Лігі.

Дабівае Англія маральна сваю Лігу.

Далей англійскі міністар заявіў, што зусім ня цэніць адносінаў з СССР, але і ня рве іх толькі дзеля таго, каб... ня страшыць ды не хваляваць іншых дзяржаваў. На запытаньне, ці толькі што адбытае „прызнаньне Бэсарабіі ўласнасьцяй Румыніі“ італьянскім урадам ня мае сувязі з нядаўным асабістым спатканьнем п. Чэмбэрлена з п. Мусоліні,—Чэмбэрлен адказаў, што, праўда, гутарка аб гэтай Бэсарабіі з Мусоліні была, але—ну, пэўна—ніякага націску на Мусоліні ён не рабіў. Проста, відаць, гутарылі аб тым, якія смачныя абрыкосы ды сьлівы растуць у Бэсарабіі.

Інтэрпэляцыя у справе адозвы «Лігі Абароны Правоу Чалавека і Грамадзяніна»

„Robotnik“ у № 60 зьмяшчае інтэрпэляцыю клюбу ППС у справе сканфіскаваньня адозвы „Лігі Абароны Правоў Чалавека і Грамадзяніна“. У гэтай інтэрпэляцыі надрукавана амаль не цалком самая адозва, ды гэтак зьмест адозвы стаўся ўжо ведамым для ўсіх. Адкінуты ўсе тыя месцы, якія маюць асабліва востры характар, падаем галоўныя думкі адозвы.

„Справа польскіх вастрогаў ужо ад некалькіх гадоў зьяўляецца прадметам бясспынных гарачых закідаў і пратэстаў. У Польшчы і заграніцай у гэтай справе выдаюцца спэцыяльныя часопісі, арганізуюцца камітэты, склікаюцца публічныя сабраньні, зьбіраюцца падпісы розных слаўных людзей“. „Адпор гэтай акцыі з боку польскіх урадавых чыньнікаў і прэсы—у найвышэйшай меры няздарны і дзеля таго хутчэй—шкадлівы. Тым часам запраўднае палажэньне (ў вастрогах), на жаль, нячувана благое“. Адозва сьцьвярджае, што — „як паважаньне права, так і звычайнае пачуцьцё чалавечнасьці не стаяць у Польшчы на належным роўні“.

„Адзіным маральна і праўна апраўданым спосабам барацьбы (з рэвалюцыяй) было б караньне праступленьняў, зробленых ці рыхтаваных, але не караньне тэй ці іншай ідэалёгіі. У нас-жа часта садзяць людзей у вастрог за перакананьні, за прыналежнасьць да партыі, узносы складак, перавозку партыйнай літэратуры. Для выкрываньня праступленьняў карыстаюцца спосабам правакацыі, да якой уцягіваюць навет школьную моладзь“.

Пазываючыся на працы аслаўленай соймавай камісіі, адозва кажа, што ў польскіх вастрогах няма біцьця, як сыстэмы. Але адозва сцьвярджае нешта мо‘ яшчэ больш жудаснае: „істнуе сыстэма не даволі энэргічных сьледзтваў у выпадках надужыцьцяў (біцьця і інш.) ды—не даволі становучага ачышчэньня вастрожнай адміністрацыі ад людзей незраўнаважаных псыхічна і неапанаваных нэрвова“.

Далей адозва сцьвярджае, што прычынай бясспынных канфліктаў, пратэстаў ды галадовак у вастрогах зьяўляецца тое, што міністэрскія і мясцовыя вастрожныя ўлады не спаўняюць самі істнуючых законаў і правілаў. Ведамы цыркуляр мін. Макоўскага аб

Як асьвятляе беларускае жыцьцё часопісь „Нацыя“.

У Варшаве выйшаў першы нумар месячніка, ахвяраванага, як сказана ў рэдакцыйнай прадмове,—„справам няпольскіх нацыянальнасьцяў, якія знаходзяцца ў Польскай Дзяржаве“. Нумар гэты быў чамусьці сьпярша сканфіскаваны польскім урадам, але пасьля канфіскацыі зьнялі, і мы можам цяпер з ім пазнаёміцца.

З вонакавага боку часопісь выглядае вельмі хараша: добры друк, добрая папера, добрая—грознага ярка-жоўтага колеру „здрады“ вокладка...—Кожны артыкул друкуецца побач у чатырох мовах: па-польску, па-нямецку, па-француску і па-англійску. Відаць, з боку выдавецкага, матэрыяльнага, часопісь абстаўлена вельмі добра.

Што датычыць рэдакцыйнага боку, дык трэба сказаць, што „баявы орган“ польскіх нацыянальных меншасьцяў пакідае шмат да жычэньня.

Перадусім трэба сказаць, што выбарная „16“ з 1922 году павялічылася яшчэ адным сябром — літвінамі; дый украінская меншасьць, якая ў першай „16“ была прадстаўлена толькі валынцамі ды холмшчанамі, цяпер рэпрэзэнтавана аб‘яднаньнем усіх буржуазных украінскіх партыяў на плятформе „нацыянальна-дэмакратычнай“ („ундо“)... Гэткім чынам, з аднаго боку часопісь абхапіла як-быццам шырэйшыя „абшары меншасьцяў“; але трэба дадаць, што, з другога боку, — з масаў, якія жывуць на гэтых абшарах, ахоплены толькі буржуазныя арганізацыі і напрамкі, ды пакінены ў старане больш радыкальныя групы... З украінскіх арганізацыяў, як сказана, рэпрэзэнтавана толькі „ундо“, з беларускіх — толькі „Беларускі Соймавы Клюб“, ці можа—яшчэ вузей: „Сялянскі Саюз“; немцы, праўда, аб‘яднаныя навет сацыяльна-нацыянальна, прадстаўлены наіўным нацыяналістам сэн. Гасбахам; жыдоўская меншасьць у Польшчы абмяжавала сябе ў часопісі сіанізмам — у асобе прадстаўніка, праўда радыкальнага яго напрамку — пас. Грюнбаўма... Ведама ж, буржуазія заўсёды і ўсюды лічыць сябе выключнай прадстаўніцай так-званай „Нацыі“, воляй і розумам так-званага „нацыянальнага арганізму“; але ў гэтай меншасьцёвай „Нацыі“ прадстаўнікі паасобных нацыянальнасьцяў навет з буржуазна-нацыянальнага пункту гледжаньня не стаяць на адпаведнай вышыні.

Зусім зразумела, што нас асабліва цікавіць беларускі артыкул меншасьцёвай „Нацыі“ ў Польшчы. Нажаль, тут беларусы стаяць—на апошнім мейсцы. Калі ўжо не вымагаць ад аўтараў артыкулаў таленту і сілы палітычнага публіцыста ці шырокай і грунтоўнай веды сучаснага і гістарычнага нацыянальнальнага жыцьця кваліфікаванага вучонага, дык ужо бясспрэчным і катэгарычным трэбаваньнем павінна быць дамаганьне **бесстароннасьці і беспартыйнасьці** у шырокім ахопе жыцьця сваей меншасьці, а перадусім—**фактычнай праўды**. І вось, мы павінны сьцьвярдзіць, што інфармацыі прадстаўніка беларускай меншасьці ў часопісі „Нацыя“, назначаныя для ўсяго культурнага сьвету, не адпавядаюць, нажаль, ніводнаму з гэтых трэбаваньняў.

Мы ня будзем падробязна даводзіць агульнай слабасьці, бязцьветнасьці артыкулу пасла Ярэміча і падабранай ім „хронікі“. Дамо толькі аб гэтым агульнае паняцьце. Але ў артыкуле ёсьць такія „абмылкі“ і такія „ўмаўчаньні“, якія робяць гэтае першае выступленьне часопісі абаронцаў нацыянальных меншасьцяў на сусьветнай арэне—амаль **не нацыянальным праступленьнем**.

— —

Рэдакцыйная прадмова кажа, што ўсе меншасьці ў Польшчы лучаць у адну армію тыя „аднолькавыя варункі — палітычныя і эканамічныя, якія вытварыла для іх польская дзяржаўнасьць“; лучыць і — „супольная барацьба меншасьцяў — проці ўціску“. І вось артыкул п. Ярэміча не дае ані агульнай характэрыстыкі польскай дзяржаўнасьці, ані сыстэмы гэтага ўціску, ані гісторыі ды сучаснага стану барацьбы беларускага народу проці ўціску.

„Мы хочам інфармаваць палітычна мысьлячую Польшчу і Эўропу аб нашых імкненьнях, аб нашых ідэалах, барацьбе і паражэньнях і перамогах“... кажа прадмова. А пасол Ярэміч—якраз аб „барацьбе, паражэньнях і перамогах“ маўчыць.— Чаму? — Таму, што тады трэба было б пісаць аб паражэньнях. „Сялянскага Саюзу“, ды аб перамогах— яго палітычнага праціўніка!

Прадмова-праграма часопісі кажа, што „інфармацыі яе будуць абаперты на аб‘ектыўных (бесстаронных) матэрыялах, на дакумэнтах і статыстычных дадзеных“.—Вось цяпер і пабачым на некалькіх прыкладах, якія „аб‘ектыўныя матэрыялы“ ды „статыстычныя дадзеныя“ ляжаць у падставе інфармацыяў п. Ярэміча.

Усіх беларусаў п. Ярэміч налічае ў Заходняй Беларусі толькі 2 мільёны, у Радавым Саюзе 8 міл., у Сібіры—1 м., у Амэрыцы—паўмільёна, у Латвіі—200.000; усяго — 12 мільёнаў. Скуль гэтыя лічбы, мы ня ведаем. Ведаем толькі, што польскай статыстыцы давяраць ня можна. Але — паводле падрахункаў Інстытуту Беларускай Культуры ў Менску — беларусаў у Польшчы ўсяго звыш паўтраця мільёна. Чаму гэта прадстаўнік беларускай „Нацыі“ схаваў ад „мысьлячай Польшчы і Эўропы“ паўмільёна сваіх братоў ды—каму з сваіх „суседзяў“ у Польшчы ён „адступіў“ іх, гэта—тайна, якую ён можа высьветліць у далейшых нумарох „Нацыі“...

Але далей—яшчэ горш.

„Паводле рэлігійнага вызнаньня чатыры пятыя часткі беларусаў належаць да праваслаўнай царквы; адна пятая—каталікі“. Гэта— з усіх 12 мільёнаў. „У Заходняй Беларусі беларусаў-каталікоў ёсьць 50 працэнтаў“. Так інфармуе Эўропу пас. Ярэміч, сам каталік.

50 прац.—гэта-ж значыць палова. Але дзе ж тыя „статыстычныя дадзеныя“, на падставе якіх п. Ярэміч дзеліць пароўну беларускае насяленьне ў Польшчы паміж каталіцкім касьцёлам і праваслаўнай царквой? Навет зусім безадказная—нацыяналістычна-клерыкальная—польская „статыстыка“, якая зусім не прызнавала ў першыя часы адраджэньня Польшчы істнаваньня беларусаў-каталікоў, залічаючы іх усіх — разам з добрай жменяй праваслаўных — да палякоў, і тая налічыла праваслаўных беларусаў каля **мільёна з чверткай!** а паводле п. Ярэміча іх выходзе ўсяго—адзін мільён...

Падамо яшчэ адзін прыклад недарэчнасьці ў артыкуле, які на старонцы 22 сьцьвярджае, што „палова ўсяго абшару (Заходняй Беларусі) належыць да вялікіх абшарнікаў, пераважна палякоў“, а на стар. 23 заяўляе, што „зямельная рэформа, праўда, **ужо праведзена ў жыцьцё**, ды зямля ад вялікіх абшарнікаў адабрана“... Польшча, якая правяла ў сябе зямельную рэформу, ці—вырашыла ў сябе — хай навет з крыўдай для няпольскага сялянства — вялізарную задачу перабудовы зямельнага ладу,—ці можа быць лепшая рэклама для польскай дзяржаўнасьці на міжнародавым форуме?!. Гэтага ня пішуць навет паны Стэцкія ў „Варшавянцы“...

У аддзеле „З Беларускага Жыцьця“ прадстаўнік беларускай „Нацыі“ ў Польшчы абмяжоўвае беларускае жыцьцё амаль ня выключна жыцьцём „Сялянскага Саюзу“, і „Хрысьціянскай Дэмакратыі“... Аб істнаваньн-

некаторых палёгках для вязьняў чамусьці абязывае толькі ў Кангрэсоўцы; дык ня дзіва, што ў рэшце польскіх вастрогаў усьцяж выбухаюць канфлікты. Адозва сцьвярджае, што міністэрства справядлівасьці „ня пільнуе, каб гэты цыркуляр тасаваўся навет і ў Кангрэсоўцы, ды маніцца зусім скасаваць наагул усялякія палёгкі для палітычных вязьняў". Адозва тлумачыць гэты праект „ненавісьцяй да людзей іншых пераконаньняў з боку палітычнай улады (міністра), якая ня прымае пад увагу, што праступленьні зроблены з матываў ідэйных, што заўсёды робяць судовыя ўлады пастанаўляючы прысуды".

„Горш, у многа разоў стаіць справа ў арыштах ды ў паліцэйскіх установах—у часе пачаткавага сьледзтва. Асабліва-ж — на „крэсах", дзе наагул слабейшы паліцэйскі пэрсанал горшы, а нацыянальная барацьба атручывае ды распаляе душы". Тут дзеюцца рэчы, якія вымагаюць найбольш суровага асуджэньня. Ня будзем паўтараць іх, бо ж яны ведамы беларусам, калі ня з уласнае практыкі, дык з нялічаных інтэрпэляцыяў нашых паслоў у Сойме.

У выніку ўсяго гэтага — піша адозва— „жыцьцё ў Польшчы робіцца панурым і цяжкім; — дзяржаўны арганізм носіць у сябе зародкі цяжкай і грознай хваробы". Вось дзеля чаго падпісаўшыя адозву лічаць, што маўчаць больш ня можна, а трэба, наадварот, голасна і ясна паставіць дыягноз і лячыць хваробу, пакуль яшчэ ня позна.

У канцы адозва высоўвае рад дамаганьняў, якія маюць на мэце лячыць гэтую хваробу Польскай Дзяржавы. Вось яны:

1. Амністыя палітычным вязьням, а перадусім непаўналетнім і засуджаным за прыналежнасьць да партыі.

2. Караньне праступнікаў выключна за ўчынкі, але не за перакананьні ці прыналежнасьць да партыі.

3. Лагаднейшы суд над прадступнікамі, асабліва адносна да моладзі.

4. Супыненьне істнуючых спосабаў паліцэйскіх спосабаў „баданьняў", асабліва на „Крэсах", скасаваньне сыстэмы правакацыі, ачышчэньне асабовага складу паліцыі ад неадпаведных, а тым больш — праступных адзінак.

5. Менш фармальнага, але больш суровага нагляду вышэйшых урадавых чыньнікаў над тым, што робіць вастрожная адміністрацыя з вязьнямі.

6. Энэргічны нагляд пракуратуры над тымі гвалтамі, якіх дазнаюць грамадзянскія правы насяленьня.

7. Прызнаньне ясных і бясспрэчных палёгкаў для палітычных вязьняў для ўсяго гаспадарства.

8. Абавязкавае залічэньне сьледчага арышту да аканчальнага прысуду — ува ўсіх палітычных справах.

Інтэрпэлянты пытаюцца п. міністра ўнутраных спраў, ці... „ведама яму аб канфіскаваньні адозвы, якая дамагаецца тасаваньня законаў у Польшчы — навет у вастрогах? А калі ведама, дык што мае ён зрабіць, каб загарантаваць грамадзянам Польшчы права свабоды слова, прызнанае ім Канстытуцыяй".

ні „Грамады" з яе блізу 100.000 сяброў даведаецца „мысьлячая Польшча і Эўропа" ў „Нацыі" п. Ярэміча толькі з кароткай заметкі аб пабіцьці паслоў Валошына і Мятлы... Аб істнаваньні ў Вільні Беларускага Нацыянальнага Камітэту, беларуская рэдакцыя „Нацыі" зусім ня лічыла патрэбным паведаміць — ані Польшчу, ані Эўропу, як роўна і аб такой запраўды агульна-нацыянальнай, зусім беспартыйнай культурна-асьветнай установе ў Заходняй Беларусі, як Таварыства Беларускай Школы з яго чысьленымі арганізацыямі і гімназіямі... Няма ўжо што казаць, што аб істнаваньні, жыцьці і працы найвялікшай, ахапіўшай увесь край легальнай партыі „Грамады" няма ў „Нацыі" пана Ярэміча ніводнай інфармацыі!

Адзначым яшчэ характэрную дэталь — з „хронікі ўціску" беларускага культурна-нацыянальнага жыцьця, асьвятленьне якога—пэўна-ж — зьяўляецца, як кажа і прадмова, найважнейшай з задачаў часопісі, падняўшай барацьбу за людзкія і грамадзянскія правы меншасьцяў у Польшчы. Падаючы вестку аб Акадэмічнай Канфэрэнцыі ў Менску ў палове мінулага лістапада, беларускі рэдактар Хронікі чамусьці ніводным словам не ўспамінае аб тым, што польскія ўлады ня выпусьцілі з сваёй дзяржавы на гэтую канфэрэнцыю запрошаных менскай Акадэміяй культурна-асьветных дзеячоў Заходняй Беларусі (апрача аднаго, які — дзеля салідарнасьці—таксама адмовіўся ехаць)... За тое — спрытна падсоўвае прыемную для сучаснай урадавай праграмы „культурна - асьветнай працы для беларусаў „думку аб тым, што навет на Менскай Акадэмічнай Канфэрэнцыі высоўвалася справа замены расейскае азбукі—лацінскай...

Пасьля ўсяго сказанага — ясна, што з беларускага агульна-нацыянальнага пункту гледжаньня „Нацыі" пасла Ярэміча, якая па думцы рэдакцыйнай прамовы павінна была-б перадусім выражаць і адбіваць агульнае нацыянальнае жыцьцё і „супольную барацьбу" кожнай меншасьці, дый усіх іх разам,—проці ўціску з боку польскай дзяржаўнасьці,— ня можна прызнаць задаваляючай. Аб барацьбе, у якой прымаюць учасьце беларускія масы, яна дае аднабокае, няпоўнае, часта партыйна-небесстароннае, часам проста нязгоднае з праўдай прадстаўленьне! І пад той час, як беларускія эмігранты шлюць з Прагі ў Лігу Народаў мэморыялы, у якіх даюць запраўды-ж трагічны абраз жыцьця і змаганьня беларусаў пад Польшчай,—польскаму прадстаўніку ў Лізе, замест апраўданьня ад усіх абвінавачаньняў, даволі паказаць сваім калегам-лігістам экзэмпляр „Нацыі"... Не дарма-ж навет пэпээсаўскаму „Роботніку" здалела дагадзіць гэная „Нацыя"!

Гэтак вялізарнай важнасьці справа асьвятленьня беларускага жыцьця пад Польшчай для міжнародавай — сусьветнай апініі папала ў зусім неадпаведныя рукі. І калі гэтую справу адважыліся ўзяць у свае рукі гэткія буржуазныя „нацыянальныя аб'яднаньні", як „Літоўскі Тымчасовы Камітэт", ці „УНДО", дык яны могуць лічыць сябе прынамся лічбова паважнымі нацыянальнымі арганізацыямі. Але — ці п. Ярэміч з сваім „Сялянскім Саюзам" ды з сваім беларуска-польскім *) „Інстытутам Гаспадаркі і Культуры" можа лічыць свае прадстаўніцтва хаця мінімальна падобным да ўкраінскага або літоўскага?!

Безумоўна не! І, калі паставіць побач з гэтым усё вышэйпададзенае, дык прыдзецца зрабіць дужа сумны вывад: што акцыя, за якую ўзяўся п. Ярэміч і ягоныя калегі, зьяўляецца папросту нацыянальным шкодніцтвам.

*) Да складу галоўнае ўправы гэнага „Інстытуту"—побач з кс. Станкевічам і Ярэмічам — належаць — палякі: сябры ўрадавае „Партыі Працы" сэнатар Кшыжаноўскі і генарал Бабянскі...

Проці маральнага бруду.

(Пісьмо ў Рэдакцыю).

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Дазвольце на страніцах Вашае часопісі выкрыць той нягодны бруд, якім заліваюць беларускае жыцьцё павадыры так-званых хадэкаў і сельсаюзьнікаў—кс. Адам Станкевіч і Фабіян Ярэміч, абодва паслы Сойму.

Пасьля таго, як ані даносы кс. Станкевіча на мяне, як „фактычнага рэдактара" аднэй з перасьледаваных уладай газэт у часе дзейнасьці прэсавага дэкрэту, не дапялі сваей мэты (газэта бы сканфіскаваба не на падставе дэкрэту, а—нармальных законаў, не караючых „фактычных рэдактароў"),—пасьля таго, як лепшая частка беларускага арганізованага грамадзянства выкінула за гэта кс. Станкевіча з Таварыства Беларускае Школы, а фальшаваньне панамі кс. Станкевічам і Ярэмічам прыгавору ў маей справе з грам. Дубейкоўскім прайшло бяз ніякага эфэкту,— гэная пара пачала пэцкаць маё добрае імя другім спосабам. Пачалося нашэптываньне на вуха ўсім беларусам, хто йшчэ згаджаўся гаварыць з гэнымі маральнымі брудасамі, — быццам я быў „інфарматарам" грам. Сьвяневіча, калі той пісаў свае рэфэраты ў беларускай справе для II аддзелу генаральнага штабу.

З прычыны таго, што надрукаваньне гэтае подлае брахні дало-б мне магчымасьць зразу-ж вывясьці яе на чыстую ваду, бо з грам. Сьвяневічам я наагул пазнаёміўся ўжо пасьля таго, як ён пісаў свае рэфэраты (ў дадатку для беларускае справы — прыхільныя!), кс. Станкевіч і Ярэміч і выбралі шлях нашэптываньня і ілжы—цішком. Каб выявіць усю подласьць гэтых людзей, я прашу падаць да ведама грамадзянства далучанае пісьмо да мяне грам. Сьвяневіча:

Вельмі Паважаны Пане!

З прычыны паведамленьня мяне Вамі аб чутках, быццам Вы давалі мне інфармацыі дзеля рэфэратаў аб беларускай справе, якія я пісаў для п. Воевудзкага, — рашуча заяўляю, што я ніколі не зварачаўся да Вас аб гэтыя інфармацыі і, насколькі мне помніцца, у часе майго супрацоўніцтва з п. Воевудзкім (канец 1922 г. — студзень 1924 г.) асабіста з Вамі наагул ня быў знаёмы. Ня помніцца такжа, каб да 1927 году вёў з Вамі якую—колечы даўжэйшую палітычную гутарку.

Шчырыя выражэньні праўдзівае пашаны і паважаньня.

(—) Станіслаў Сьвяневіч.

Вільня, 7. III. 1927.

Адзначаю, што грам. Сьвяневіч—ідэйны праціўнік як мой, так і блізкай мне па ідэалёгіі „Грамады",—але сьцярпець бруду ня мог і даў сьвядоцтва праўдзе.

Думаю, што гэты дакумант будзе найлепшым доказам нягоднага паступаньня павадыроў хадэцыі і сельсаюзьнікаў.

Антон Луцкевіч.

Вільня, 10. III. 1927.

ХРОНІКА.

Чарговыя публічныя лекцыі. У суботу, 12 сакавіка, у 7 гадз. увечары, у памяшчэньні Цэнтральнага Гуртка Т-ва Беларускае Школы (вул. Сьв. Анны 2) адбудзецца чарговая публічная лекцыя **аб творчасьці беларускага паэта Алеся Гаруна** (Ал. Прушынскага). Лекцыю, якая прыпадае акурат у 40-выя ўгодкі ўрадзін паэта, прачытае **д-р Ігнат Дварчанін**. Уступное слова скажа грам. Ант. Луцкевіч. Больш характэрныя адрыўкі з твораў Алеся Гаруна будуць прадэклямаваны.

Лекцыя **грам. Зянюка**, якая была вызначана на мінулую суботу і не магла адбыцца з прычыны вызначанага на той-жа дзень „суботніку" на карысьць незаможных вучняў Віленскае Беларускае Гімназіі, — перанесена на суботу 19 сакавіка. Грам. Зянюк будзе чытаць **аб зямельным пытаньні**.

Хто вырашае ў нас „нацыянальныя справы"? „Кур. Віл." паведамляе, што ў Вільню прыехаў начальнік нацыянальнага аддзелу міністэрства ўнутраных спраў Сухэнэк-Сухэцкі. Як падыходзе ўрад марш. Пілсудскага да вырашэньня нацыянальных спраў „меншасьцяў", відаць з таго, што п. Сухэнэк паклікаў у Вільню, як „дарадцаў", „шэфаў бясьпечнасьці" чатырох ваяводзтваў Заходняе Беларусі: віленскага, навагрудзкага, беластоцкага і палескага...

Навагрудзкі „шэф бясьпечнасьці" ўжо прыехаў. Гэта—ведамы з беластоцкага працэсу абвініцель пасла Барана капітан Ярэцкі. Ну, як „вырашацца" нацыянальныя справы на гэтай асаблівай нарадзе, можна сабе нaперад прадставіць, хаця-бы на падставе аднаго гэтага імя!

Нягоднікі далей „працуюць"! Абшарніцка-фашыстаўскае „Слово" ўсьцяж расьпісавае ўсякія подласьці на Грамаду і яе дзеячоў. Надовячы газэта гэная абвінавaціла Грамаду ў забойстве і абрабаваньні цэлае сям'і ў Навагрудчыне. Навет яўна варожы да грамадаўскага руху „Кур. Віл." пасароміўся за сваіх мілых калегаў і заявіў, што сьледзтва выкрыла тут звычайны бандыцкі напад — бяз ніякае сувязі ані з палітыкай, ані з Грамадой!

Вось, якую „мараль" прышчапляюць польскаму грамадзянству фашысты! І дзівуюцца пасьля гэтага, што маральнасьць у Польшчы ўсё больш і больш занікае!

Забастовачны рух. Забастоўка шаўцоў і гутнікаў у Вільні трывае далей. Як падае віленская прэса, гаспадары рашуча адмаўляюцца ісьці на якія-колечы ўступкі. Становішча работнікаў цьвёрдае, але спакойнае.

Спыненьне працы. Надовячы спынілі работу два вялікшыя тартакі ў Вільні: кальварыйскі Гордона і на Антокалі Гершатэра. Прычына—благія варункі ў тартачнай прамысловасьці наагул і адсутнасьць заказаў.

Гэтак ізноў грамада работнікаў апынулася на бруку...

Афіцыяльны курс грошы на 11 сакавіка. Даляр — 8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

11./III. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70 Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Грамадзкая ахвярнасьць.

× Мала-Валянскі Камітэт гуртка Б.С.Р. Грамады, Курылавіцкай гміны, прыносіць шчырую падзяку жыхарам Мала-Волі за зложаныя ахвяры на карысьць палітычных вязьняў у суме 20 злотых. 8.III 1927 г.

× Камітэт гуртка Б. С. Р. Грамады ў в. Востраве, Старавейскае гм., прыносіць шчырую падзяку жыхарам в. Вострава, злажыўшым ахвяры ў суме 32 зл, 75 гр. на залог дзеля вызваленьня з турмы 4 вязьняў—грамадзістаў.

× Камітэт гуртка Б. С. Р. Грамады ў хутары Вострава, гміны Старавейскае, прыносіць шчырую падзяку жыхарам хут. Вострава за зложаныя ахвяры ў суме 11 зл. 25 гр. на злажэньне каўцыі дзеля вызваленьня з турмы 4 вязьняў — грамадзістаў. 8.III-1927 г.

× Гурток Т-ва Бел. Школы ў в. Касьцянях, Слонімскага павету, складае шчырую падзяку ўсім грамадзянам, паданым тут, склаўшым ахвяры на бібліатэку-чытальню ў в. Касьцяні:

Грамадзяніну Ванькоўскаму за 1 злот, Багданчуку Мікалаю — 50 гр., Мандрыкевічанцы Вользе — 40 гр., Мандрыкевічу Сяргею — 40 гр., Марозу Андрэю — 1 зл., Саванцу Лукашу — 1 зл., Марозу Вінцуку — 50 гр., Марозу Герасіму — 40 гр., Касьцянеўскаму гуртку Б. С. Р. Грамады — 15 зл., Маразянцы Зосі — 50 гр., Багданчанцы Веры — 25 гр., Маракевічу Сьцяпану — 50 гр., Рудаку Даніле—22 гр., Марозу Янку—50 гр., Бардую Аляксандру — 30 гр., Марозу Пятрусю Антонаву—1 зл., Дабрыяну Андрэю—90 гр., Марозу Васілю — 40 гр., Грэцкаму Рыгору — 1 зл.; Саванцу Хвёдару, Саванцу Лявону, Марозу Лук'яну, Саванцу Юстыну, Кодзіку Уладзіміру, Багданчуку Сяргею, Мандрыкевічу Адаму, Савіцкаму Абраму, Місцы Андрэю — за ахвяру па 1 зл., Карбовічу Пятрусю—50 гр., Вянскоўскай Палагеі—20 гр., Маразянцы Зосі—20 гр., Якімчанцы Ганне—30 гр., Маразянцы Алесі — 35 гр., Коншыну Аляксею — 50 гр., Багданчуку Сяргею — 50 гр., Марозу Рыгору — 30 гр. Разам ахвяравана 30 злотых грамадзкіх грошы. Шчырая падзяка складаецца таксама грамадзянам: Маразянцы Наталіі, Рудаку Даніле, Сьвіту Міхасю, Батку Сьцяпану і інш. за ахвяраваныя на бібліатэку кнігі.

Гурток Т-ва Бел. Школы
ў в. Касьцяні Слонімскага пав.

Змагаром Беларусі.

„Вы жадною толпой стоящие у трона,
Свободы, гения и правды палачи!...
М. Лермантаў,

Сыноў ад плуга і касы
Саслалі ў цёмныя кавуры...
Сяўцоў прасьветы і культуры
Сагналі з роднай паласы!
. . . .
Дарма! Апошняя патуга —
Рукамі мора ўтрымаць,
Людзкую крыўду ўтамаваць
Дубінай, стальлю і падпругай.
Дарма ўрачыстасьці сьвяткуюць
Усей чорнай сотні груганы;
Дарма з трыўмфамі зьвястуюць
Зварот прагніўшай старыны.
. . . .
Бурліць Народная стыхія,
На бераг выйшаў акіян.
Трашчыць старога сьветушыя
Канае згніўшай сілы пан.
Жыцьця бушуючае мора
Са дна іх выплюне за вал.
І запануе на прасторы
Агульналюдзкі ідэал...

Вільня, 24.II 1927. Лявон Чачотка.

З жыцьця Горадні.

× **Звальненьне М. Якімовіча.** 4 сакавіка с. г. з Горадзенскага вастрогу зволынілі заарыштаванага старшыню Горадзенскага Гуртка Б.С.Р. Грамады Мікалая Якімовіча.

× **Працэс 65.** 4 красавіка будзе разглядацца справа 65 сялян, абвінавачаных у прыналежнасьці да камуністычнае партыі Заходняй Беларусі, якая мела на мэце адарваньне ад Польшчы Зах. Беларусі і далучэньне яе да Радавай.

× **Хто аказаліся бандыты.** Пара месяцаў таму невядомыя асобы абакралі ўвесь чыста гарадзкі лямбард. „Ачысьцілі" і замялі сьлед (ведама, бо былі спэцыялісты па замятаньню сьлядоў)! І вось, у пачатку гэтага месяца сьледчая паліцыя ўсё-ж трапіла на сьлед і выкрыла гэтых бандытаў, якія аказаліся: былы пшодоўнік паліцыі Ястржэмбскі Ян і быўшы пастарунковы Францішак Роснэр.

× **Падзяка.** 5 сакавіка с.г. Горадзенскай Акружнай Управай Т-ва Беларускае Школы ў салі клюбу жыдоўскіх рамесьнікаў зладжаны быў спэктакль-вечар. Зграны былі дзьве камэдыі: „Пасланец" і „Конскі партрэт". Увесь чысты збор быў празначаны на беларускі прыпынак у Горадні. Пасьля спэктаклю дэклямаваліся вершы, па якіх наступілі скокі да раніцы. Асаблівую ўвагу зьвярнулі на беларускі нацыянальны танец Лявоніху.

Управа Т-ва прыносіць шчырую падзяку тым грамадзянам, якія ўшанавалі сваей прысутнасьцю спэктакль-вечарыну.

Таксама вялікая падзяка артыстам, якія добра ігралі: грам. Н. Ламашэвічанцы, Яз. Баліцкаму, Яз. Клімовічу, грам. М. Моцхку і ўсім сябрам Таварыства за чыннае ўчасьце ў вечарыне.

Чэсьць вам сябры — барацьбіты з цемрай! Змагайцеся з усякай перашкодай, стаўленай нам на кожным кроку, нясіце і пашырайце асьвету між свайго народу — з той надзеяй, што раней ці пазьней дойдзем да лепшае будучыны. **Молат.**

„Беларускі Дзень".

Клапоцячыся аб даваньне беларускай масе „здаровае духовае стравы", вольнае ад усялякае „антыпаньствовасьці", — урад прыступіў да выдаваньня новае часопісі ў беларускай мове пад назовам **„Беларускі дзень".** Рэдагуе яе і падпісаваецца за выдаўца грам. Ф. Умястоўскі.

Газэта мае запоўніць нястачу органа, які, адкінуўшы „вялікую палітыку", працаваў-бы выключна дзеля падняцьця беларускае культуры і гаспадарчага жыцьця. Можна было-б гэта шчыра прывітаць, калі-б рэдакцыя ў першым-жа нумары ня выявіла свайго запраўднага аблічча.

Аблічча-ж гэтае—бэсьціць ўсё, што твораць беларусы **па за межамі Польшчы**, і хваліць усё тое, чаго... мы ня ў сілах тварыць пад Польшчай з прычыны асаблівае „апекі" над намі...

Вось адна з „красачак" газэты. Выступаючы з агітацыяй за пераход беларусаў з гражданкі на лацініку (як гэтага хоча польскі ўрад!), „Беларускі дзень", які **сам друкуецца гражданкай**, піша паміж іншым:

„Колькі ні шукай аргумэнтаў проці лацінікі,—іх трудна знайсьці. Есьць, праўда, аргумэнты другога сорту: баяцца, што трудна будзе перавыдаць усё, што надрукована за апошнія гады ў Менску. Непакоіцца з-за гэтага няма чаго,—бо перавыдаваць **мала што прыдзецца**, бо тая культура, што ў Менску, **не беларуская**, а савецкая, культура з-пад палкі і навет на адзін процант **не выяўляе запраўдных глыбінаў беларускага народнага духу**".

Правільна! Колас, Купала, пакуль друкавалі свае рэчы ў Вільні ці Пецярбурзе (ведама: царскім!),—дык выяўлялі гэты дух; але цяпер, калі друкуюць іх у сталіцы самастойнае Беларусі,—дык „ні на адзін процант" яго не выяўляюць! Стараецца пан Умястоўскі дагадзіць сваім „хлебадаўцам"! Так стараецца, што забыўся навет аб тым, што і ўся беларуская літэратура, друкаваная ў Вільні і Пецярбурзе ад 1906 году, (навет уласныя творы п. Умястоўскага!), **выходзіла ў 99% гражданкай**,—дык мо' варта было-б і яе

перадрукаваць?! А можа беларускі рух паводле пана рэдактара пачнецца наагул толькі ад дня выхаду „Беларускага Дня“?!

На гэта як быццам паказуе жаданьне рэдакцыі казённае газэты, перачыркнуўшы ўсю 20 гадовую творчую працу беларускага народу, зьвязацца з першай беларускай часопісяй нашых рэвалюцыйных адраджэнцаў 1906 году—„Нашай Доляй“, у якой прымаў учасьце-побач з другімі — і пан Умястоўскі, ды з трэцяга нумару газэты парваў усякую сувязь як з „Н. Д“, так і бадай з усім беларускім рухам. Маем сьведкаў, што п. Умястоўскі публічна заяўляў у апошнія гады, што ён—паляк, дый дзетак сваіх, ведама-ж, узгадоўвае на добрых палякоў — у польскіх Гімназіях!... Праўда, адно ён хоча перасадзіць з „Н. Д.“ у сваю газэціну. „Наша Доля“ абвясьціла непрымірымую барацьбу расейскаму царскаму ўраду і — польскім абшарнікам. Вось жа, ні слова не ўспамінаючы аб апошніх, „Наш Дзень“ абяцуе... вясьці распачатую „Нашай Доляй“ у 1906 годзе барацьбу з панаваньнем маскоўскіх цароў, якое ў 1927 годзе... ня існуе!

Запраўды-ж газэта мае на мэце барацьбу з арыентацыяй на беларускі Менск і з камуністычнымі настроямі сярод беларускіх масаў, як аб гэтым сьведчыць увесь зьмест стацей і літэратурных твораў. Ну, і трэба ясна і выразна гэта сказаць, не падшываючыся пад ідэалёгію „Нашае Долі“, якая была фактычна органам „Беларускае Сацыялістычнае Грамады“. Хіба-ж запраўдныя выдаўцы „Беларускага Дня“ не падзяляюць ідэалёгіі гэнае партыі,—дык пашто такі маскарад?!

КАРЭСПАНДЭНЦЫ

Пратэст процi арыштаў беларускіх паслоў.

(в. Масаляны, Горадзенскага пав.).

6 га лютага 1927 года ў нядзелю ў вёсцы Масалянах пасьля сканчэньня абедні ў царкве, адбылася дэманстрацыя ў знак пратэсту проціў арыштаў беларускіх паслоў — і працаўнікоў Грамады. Пагода была цёплая і прыемная, дык сабраліся людзі аж з 3 прыходаў. Дэманстрацыя пачалася ад царквы праз усю вёску. Таўпа лікам 800 чалавек пад сьцягам Масалянскага гуртка, з пяяньнем Нацыянальнага Гімну „Ад веку мы спалі“, рушылася праз вёску. Народ, не зьмясьціўшыся на вуліцы, стаяў на загародках (бруках) каля хатаў. Праз увесь час паходу нясьліся пад гром воплескаў: Няхай жыве Грамада! Паход затрымаўся каля памешканьня Гміннага К-ту, дзе пад гром воплескаў вынесена рэзалюцыя: Дамагаемся звальненьня беларускіх паслоў; Звальненьня палітычных вязьняў; Зямля сялянам бяз выкупу; Дамагаемся ўрадовай беларускай школы; Пратэстуем проціў парцэляцыі зямлі пад асадніцтва; Проці прадажы беларускіх лясоў; Проціў рэпрэсіяў да беларускай люднасьці. З лёзунгамі! Няхай жыве Грамада!—таўпа разышлася ў поўным парадку.

7./II быў арыштаваны Гмінны Камітэт Бел. Сял.-Раб. Грамады і камітэт гуртка і адасланы ў сьледчую экспазытуру 9 чалавек; з іх 6 звольнены разам з сэкрэтаром Вараб'ёвым, а 3 пакуль-што трымаюць.

Масалянскі Гмінны К т
Бел. Сял.-Раб Грамады.

„Доктар“ Павлюкевіч пачынае лячыць грамадзістаў.

(Горадзенскі пав.).

Ні разу ня прыходзілася мне пісаць у Рэдакцыю, але, убачыўшы адозву пана Павлюкевіча, я ня мог удзяржацца, каб не адазвацца на яго брахню і махлярства. Гэны пан у сваіх адозвах, якімі толькі спосабамі не стараецца аблаяць Грамаду, якімі толькі спосабамі не стараецца прыпісаць Грамадзе розны бруд, а сам, як-бы збавіцель, „шчыра і чэсна“ заклікае ў сваю „найпраўдзівейшую“ раду. Але ня ў нас гэта яму зрабіць. Каб хоць адна душа знайшлася, якая магла б паверыць яго яўнай брахні, каб хоць адзін чалавек, узяўшы ў рукі яго адозву, не пасьмяяўся над яго брахнёю і махлярствам. Дык увесь гэты водклік на яго адозву нашага грамадзянства (не гавару аб адных грамадзістах) мне і хацелася б апавясьціць у газэце.

Я. Х.

Жыцьцё адных і другіх.

(Баранавіцкі павет).

Нашая вёска перажывае цяжкі крызіс. Мала — і беззямельле, бязхлебіца ў сувязі з сёлетнім неўраджаем, недахват заробкаў, закрыцьцё граніц дзеля выезду эмігрантаў—натуральнага прыросту насяленьня, няпрыйманьне на службу інтэлігэнцыі і спэцыялістаў, як былыя вучыцялі, урадоўцы, жалезнадарожныя служачыя і т. п., падаткавыя цяжары і масавыя пратаколы за неаплату падаткаў усё гэта стварыла такую цяжкую атмасфэру, што селянін проста задыхаецца. Разгледзім гэта падрабязна. Малазямельле даходзіць да зэніту. Калі перад вайной для прыросту насяленьня быў просты выхад: эміграцыя ў Амэрыку, шуканьне заробкаў на фабрыках у глыбіні Расеі, — дык сягоньня яго нямашака: выезд за акіян закрыты, закрыты таксама адход у глыб Расеі рыжскай мяжою. Мала гэтага: акалічныя аб пары дворнай зямлі, дзе селянін урабляў кавалак на „трацяк“, ці зарабляў які грош, разданы і раздаюцца асаднікам, праводзіцца каляніізацыя, селяніну яго варштат працы з пад носа адабралі. Заробкаў няма абсалютна, у краі безрабоцьце: калі дзе адкрыюцца якія лясныя работы, туды зараз наедзе галілейцаў, дык беларусу і тут не хапае мейсца. Інтэлігэнту ці спэцыялісту няма дзе дзецца, калі ён сьвядомы, актыўны ды плюс праваслаўны. Падаткі пры цяперашнім крызісе надта вялікія, а калі да гэтага дабавіць пратаколы, якія паліцыя за ўсялякія драбніцы робіць, дык становіцца проста душна. Урэшце праз усякія „аблавы“, вобыскі, арышты, паліцэйскія надзоры, ці-ж мала церпіць вёска маральна і матар'яльна?! Дык, калі ўсё гэта падсумаваць, мы пабачым, што жыцьцё вёскі проста адчайные.

А побач з гэтым якія ж цёпленькія, выгодныя, проста „люксусовыя“ мейсцы займаюць „сяўцы заход. культуры“—асаднікі! Прыклад: у Зубелявічах, Баранавіцкага павету, між іншымі сядзіць асаднік п. Каспржыкевіч. Атрымаў ён ад ураду 10 ці 20 гэктараў найлепшае ворнае зямлі (дзе раней былі агароды) і будынкі, а калі да гэтага дабавіць тыя пазычкі, што звычайна атрымоўвае кожны асаднік, то на гэтрй дзялянцы можна было-б жыць цэлай сям' і „прыпяваючы“. Але гэтаму пану асадніку мала гэтага, дый на што яму працаваць, калі для працы створаны хто другі? Вось, ён служыць у войску капітанам. Мала гэтага: бацьку яго ўрад плаціць салідную эмэрытуру (пэнсыю за выслугу гадоў), — здаецца, больш за 200 злотых. І яшчэ мала: сястра кіраўнічкаю 7 аддз. школы. Асталася бяз пэнсіі толькі адна маці. Вось дзе райскае жыцьцё!

Недалёкі сусед.

„Ашчаджаюць“.

(Пархвенаўшчына).

У в. Заборцы „месьціцца сталярская rzemieślnicza“ школа, у якой ёсьць варштаты і ўсе патрэбныя інструмэнты; ёсьць навет і „profesór“ п. Лапіцкі. Але да канца студзеня с. г. ня было ні аднаго вучня, хацяя навука пачалася з 1./IX. 1926 г, Аднак, п. „profesór“ ня траціў гумару і „sam jeden“ меў „zajęcia praktyczne“, на якіх рабіў розныя рэчы на прэзэнт кіраўніку Пархвенаўскай 7 кл. школы, пад наглядам якога знаходзіцца „rzemieślnicza szkoła“ і які выплачываў п. Лапіцкаму, што-месяц 150 зл. з соймікавых грошы.

Свой С.

Характэрны дакумэнт.

Мы атрымалі дзеля апублікаваньня вельмі характэрны дакумэнт, які лепш за ўсялякія доказы характэрызуе „дзеяльнасьць“ знамянітага „доктара“ Павлюкевіча і тых людзей, якія йдуць у „полёнофільскую“ партыю дзеля ...грашовае дапамогі!

Вось гэты дакумэнт:

Пратакол

Паседжаньня Прэзыдыуму Акружнога Сэкрэтарыяту Беларускае Нацыянальнае Рады ў Горадні, адбыўшагася 2-га сакавіка 1927 г.

Прымаючы пад увагу што:

1) 16-га лютага г. г. адбылася канфэрэнцыя па ініцыятыве старшыні Бел. Нац. Рады п. Павлюкевіча, на каторым мы былі **вызначаны** ў прэзыдыум і адначасова атрымалі належныя дырэктывы дзеля працы палітычна-эканамічна-культурна-асьветнай у Бел. Нац. Радзе;

2) Што старшыня п. Павлюкевіч, даўшы гэные дырэктывы, абяцаў болей **рэальную помач** дзеля азначанай вышэй працы, каторая магла з аднаго боку выявіць энэргію нашу і з другога боку апраўдаць даручаныя прэзыдыуму **дырэктывы**;

3) Што 23 га лютага гэтага году за № 2, прэзыдыум знайшоў патрэбным паведаміць афіцыяльна й старшыню Бел. Нац. Рады аб сваей рэальнай працы, зробленай у досьць кароткі час, а таксама: паведаміў аб матар'яльным палажэньні нашага сэкрэтарыяту, каторы **бяз гэнай запамогі далей ня мог вясьці сваю працу**, паводле чаго і прасіў у старшыні выслаць у незабаўным часе нам матар'яльную запамогу, але-ж прайшло досьць ня мала часу і п. Старшыня Белар. Нац. Рады ня толькі **ня выслаў гэтага, чаго прасілі**, але навет ня лічыў патрэбным паведаміць нас, чаго маем чакаць;

4) Што паводле гэтага ня маючы **жаднае надзеі ў будучыні на прадукцыйную працу нашу і ня хочучы лічыцца прэзыдыумам толькі на паперы, што можа нас вельмі кампрамітаваць ня толькі перад уладаю, але і сярод нашага грамадзянства**, знайшлі патрэбным зьліквідавацца дзеля чаго

Пастанавілі:

З дня 2 га сакавіка г. г. лічыць акружны Сэкр. Бел. Нац. Рады ў Горадні **зьліквідаваным**, аб чым паведамляем старшыню Бел. Нац. Рады п. Павлюкевіча адпісам гэнага пратаколу, а таксама паведаміць аб гэтым мясцовую прэсу.

Старшыня Прэзыдыуму **Адамовіч.**
Сэкрэтар **С. Новік.**
Сябра **А. Грыгаровіч.**

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрыяе разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

З Радавае Беларусі.

Збор на помач Заходняй Беларусі.

Вестки аб недародзе, ад якога сёлета крэпка пацярпела Заходняя Беларусь, выклікалі жывы водгук сярод беларускага сялянства Радавае Беларусі. Усюды йдзе збор збожжа і грошы на дапамогу пацярпеўшым ад неўраджаю. Менскія газэты запоўнены справаздачамі са збору, які дае вельмі паважныя вынікі. Пытаньне толькі, ці польскія ўлады ня будуць ра[illegible] перашкодаў пры перасылцы сабраных ахвяр у Заходнюю Беларусь і падзеле іх між нашымі сялянамі.

Адгукнулася і места. Бадай у-ва ўсіх фабрыках і заводах работнікі робяць адлічкі ад сваіх заробкаў—на карысьць галадаючых.

Вялізарная страта.

Польскія газэты зьмясьцілі тэлеграму з Масквы з 8-га сакавіка, у якой наказуецца, што ў Менску ад пажару згарэў склад цэнтральнай кнігарні Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

З увагі на тое, што за апошнія гады Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва выпусьціла ў сьвет вялізарную лічбу беларускіх кніжак, як літэратурнага, так і навуковага зьместу, — страта, выкліканая пажарам, адаб'ецца вельмі блага на нашай культурнай працы наагул.

Усячына.

Новае дасягненьне радыё.

Англійскі вынаходца Бэрд дэманстраваў у Лёндане надуманы ім спосаб перадачы па радыё малюнкаў прадметаў, якія рухаюцца і знаходзяцца ў поўнай цемры. Вынаходка Бэрда грунтуецца на тым, што ўсе відзімыя праменьні затрымліваюцца асобнымі фільтрамі, а перадаюцца толькі праменьні нявідзімыя для вока—„інфра-чырвоныя“ праменьні, якія, пападаючы на сьвета-чулы элемэнт прыёмніка, праектуюць на экране, адбіваючы руховыя малюнкі. Гэтае новае дасягненьне радыё вельмі каштоўна ў ваеннай і марской справе, бо дасьць магчымасьць выяўляць начны рух варожага войска, абозы, ваенныя караблі, падводныя лодкі.

Мэханічныя дамы.

Венскі муніцыпалітэт прыняў праект пабудовы вялікіх дамоў, усе часткі якіх, ад страхі да падмуроўкі, мэханізаваны. Згодна праекту, дом мае сотні памешканьняў, разьдзеленых нярухомымі сьценамі. У сярэдзіне кожнага з гэтых памешканьняў, націснуўшы кнопку, падводзіцца рухомая сьцяна, у фрамугах якой разьмешчаны рэчы хатняй патрэбы. Калі націснуць кнопку другі раз, гэтыя рэчы высоўваюцца і лёгка разьмяшчаюцца ў пакоі. Такім чынам, па жаданьню пакой можа быць перароблен у залю, сталовую, спальню і г. д. Мэта такіх дамоў—пры найменшай плошчы, даць найбольш кватэрнай прыгоды, што і дасягаецца ўжываньнем вядомай у тэатральнай тэхніцы сыстэмы рухавых сьцен, якія па жаданьню могуць круціцца ў любым напрамку.

Шоўк із сьмяцьця.

Нямецкі інжэнер Вэрзон пасьля шматгадовых вопытаў адшукаў спосаб, як здабываць шоўк із звычайнага сьмяцьця. Спосаб гэты—аддзяленьне клетчаткі (расьліннай масы) ад іншых частак сьмяцьця. Клетчатка далей перарабляецца ў тканіну, якая мае ўсе якасьці і асаблівасьці шоўку.

Аўтамабільная дарога на стрэхах.

У амэрыканскай сталіцы Вашынгтоне ўстроена на аднэй вуліцы адзіная ў сьвеце аўтамабільная дарога на стрэхах дамоў. Дамы па гэтай вуліцы амаль што аднальковай вышыні, а таму строіць такую дарогу было ня надта цяжка. Дарога на стрэхах зроблена з бэтону, і на ёй свабодна могуць разьехацца чатыры аўтамабілі. У пачатку і ў канцы вуліцы пастаўлены дзеля пад'ёму і спуску аўтамабіляў спэцыяльныя пад'ёмныя машыны.

Экспэдыцыя дзеля адшуканьня мэтэорыта

Акадэмія Навук ССРР паслала ў сібірскую тайгу экспэдыцыю дзеля адшуканьня аграмаднага мэтэорыта (нябесны камень), які зваліўся 30 чэрвеня 1908 году. Апрача выключна навуковай цікавасьці, мэтэорыт зьяўляецца аграмаднай матар'яльнай каштоўнасьцю. Па навуковых вылічэньнях, вага яго даходзіць да 30 мільёнаў пудоў. Пераважны склад яго—жалеза, у масе якога знаходзіцца значны процант нікеля, срэбра, плаціны і іншых мэталаў. Гэта—найвялікшы ад усіх мэтэорытаў, якія калі небудзь зваліліся на зямлю. Валячыся мэтэорыт выклікаў вялікі здрыг глебы і запаліў тайгу на значных прасторах.

Штучны дождж.

Група навуковых працаўнікоў ленінградзкага радыёвага інстытуту сканструіравала спэцыяльны апарат, пры дапамозе якога можна з атмасфэры выклікаць штучны дождж. У паветры заўсёды ёсьць пэўная колькасьць вільгаці, якую можна згусьціць, каб з яе пашоў дождж. Прыбор, змайстраваны ў радыёвым інстытуце, выклікае штучны дождж доўгім разрадам электычнай энэргіі ў паветры. Першы-раз гэты новы апарат будзе ўжыты ў засушлівых частках ССРР.

Бокс сьляпога і аднаногага.

У Брайтоне (Англія) адбылося цікавае публічнае спаборніцтва ў бокс паміж двума інвалідамі: сьляпым капітанам Лауры і аднаногім маёрам Леахі. Спаборніцтва сабрала аграмадную колькасьць глядачоў. Пераможцай аказаўся сьляпы капітан Лауры.

Ядам або электрычнасьцю.

У Амэрыцы прынят закон, якім усім прысуджаным да кары сьмерцю даецца права выбіраць электрычнае крэсла, або яд. У тым выпадку, калі асуджаны выбірае яд, аб моманце, калі яго будуць труціць, ён ня будзе ведаць. Калі-ж асуджаны адмаўляецца выбіраць, права выбару даецца яго сваякам.

Горадзенская Акружная Управа Таварыства Беларускае Школы

абвяшчае **РЭГІСТРАЦЫЮ** ўсіх беларускіх вучыцялёў, якія жывуць на тэрыторыі Горадзенскага павету. Рэгістрацыя будзе цягнуцца да 1 красавіка с. г. Пры рэгістрацыі трэба прадстаўляць дакумэнты, якія сьцьвярджаюць вучыцельскую прафэсію.

Хто ня можа зьявіцца асабіста па якім колечы прычынам, то трэба ў пісьме падаць наступнае: 1) імя і прозвішча, 2) дзе жыве, 3) колькі мае гадоў, 4) дзе і ў якім годзе і якую скончыў школу, чы вучыцельскую сэмінарыю, 5) чы мае польскае абыватэльства, якія дакумэнты аб гэтым могуць сьведчыць.

Лісты просяць кіраваць на імя Управы:. м. Горадня, Парахавая вул., № 4, п. 42

Старшыня **Яз. Баліцкі.**
Сэкрэтар **Зм. Кулакоўскі.**

Рэдактар-Выдавец: **М. Машара.**

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.